# НАШ БУРАВЕСНІК

Шырока адзначае калектыў універсітэта 100-гадовы юбілей Буравесніка рэвалюцыі. Яму прысвячаюцца лекцыі і гутаркі, канферэнцыі, кніжныя выстаўкі, вечары.

На працягу трох дзён у гуманітарным корпусе ішла навукова-тэарэтычная канферэнцыя, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння Аляксея Максімавіча Горкага. Выкладчыкі і студэнты знаёміліся з даследаваннямі беларускіх вучоных, якія раскрываюць глыбіні таленту і асобы вялікага пралетарскага пісьменніка, шматграннасць творчых сувязей Горкага з братнімі літаратурамі.

З дакладамі—«Горкі і некаторыя пытанні рэалізму», «А. М. Горкі і культура беларускага народа», «М. Горкі і Я. Колас», «Лінгвістычны аналіз лексікі «Песні пра Буравесніка» і яе беларускага перакладу» — выступілі прафесары Ф. І. Куляшоў, М. Р. Ларчанка, Л. І. Фіглоўская, М. Г. Булахаў і А. Е. Супрун. Дацэнты Б. П. Міцкевіч, І. П. Кахно, Н. В. Галаўко, З. С. Мелкіх, І. Я. Навуменка, Н. І. Лапідус, В. А. Захарава, В. М. Цімафеева і многія іншыя паказалі Горкага не толькі як мастака, заснавальніка сацыялістычнага рэалізму, але і выхаваўцу бліскучай плеяды савецкіх пісьменнікаў, прагрэсіўных прадстаўнікоў літаратуры многіх краін.

Мы звярнуліся да ўдзельнікаў з просьбай падзяліцца сваімі ўражаннямі аб прайшоўшых ва універсітэце студэнцкай і выкладчыцкай Горкаўскіх канферэнцыях. Вось як ацэньваюць іх

Прафесар М. Г. БУЛАХАЎ:

— Навуковая канферэнцыя, прысвечаная А. М. Горкаму, паказала глыбокую зацікаўленасць студэнтаў філалагічнага факультэта да творчасці вялікага пралетарскага пісьменніка. Аб гэтым сведчыць тэматыка студэнцкіх дакладаў (філасофска-эстэтычныя погляды

(Працяг на 2-й стар.).



Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

№ 12 (703) • Пятніца 29 сакавіка 1968 г. • Цана 2 кап. Год выдання XXI

# ВЕЛІЧ ПІСЬМЕННІКА-РЭВАЛЮЦЫЯНЕРА

« Калі б я быў крытыкам і пісаў кнігу пра Максіма Горкага, я б сказаў у ёй, што сіла, якая зрабіла Горкага тым, што ён ёсць, якім ён стаіць перад вамі... заключаецца ў тым, таварышы, што ён першы ў рускай літаратуры, мабыць, першы у жыцці вось так, асабіста, зразумеў велічнае значэнне працы, якая стварае ўсё найбольш каштоўнае, усё прыгожае, усё вялікае ў гэтым свеце».

У гэтым самапрызнанні Максіма Горкага — цудоўная характарыстыка асобы вялікага пралетарскага пісьменніка, усё жыццё якога сапраўды было подзвігам працы, а творчасць з'явілася палымяным гімнам чалавеку-працаўніку і яго рэвалюцыйнай барацьбе за сваё сацыяльнае і духоўнае разняволенне ад іга эксплуатацыі, за перамогу сацыялізма.

М. Горкі належыць да таго гераічнага пакалення рускіх людзей, на долю якіх выпала нялёгкая задача падрыхтоўкі і здзяйснення ў Расіі пераможнай пралетарскай рэвалюцыі.

У біяграфіі Горкага, яго жыццёвым лёсе відавочна раскрываецца гістарычны лёс народаў нашай краіны на рубяжы двух стагоддзяў. Сын ніжагародскага рабочага-сталяра, Горкі з дзесяцігадовага ўзросту на сабе адчуў усю цяжкасць паднявольнай працы і неаслабную жорсткасць эксплуататараў, спаўна пазнаў патрэбу ў пазбаўленні, якія былі лёсам мільёнаў працоўных да Кастрычніка.

Ужо тады, у дзяцінстве і юнацтве, ён, па яго словах, быў уражаны «цяжкасцю працы адных і жывёльным дабрабытам іншых», у ім паволі ўзнікала і паступова наспела пачуццё нянавісці да паразітычных класаў, выкрышталізавалася разуменне свайго «арганічнага радства з рабочым класам».

І калі восенню 1892 года ў друку з'явілася першае горкаўскае апавяданне «Макар Чудра», чытачу было зразумела, каму аддаў свае сімпатыі малады пісьменнік, каго ён горача любіць і каго глыбока ненавідзіць.

На самым пачатку сваёй творчасці Горкі выступіў выразнікам запаветных дум і спадзяванняў рускага народа, яго імклівых парываў «да свабоды, да свету». У цыкле сваіх ранніх рэвалюцыйна - рамантычных твораў, асабліва такіх, як вядомая «Песня аб Сокале», «Старая Ізергіль», Горкі паэтызаваў людзей бясстрашнага подзвігу, услаўляў веліч іх барацьбы за свабоду, горача вітаў «адвагу смелых», і бачыў сапраўдную мудрасць жыцця ў барацьбе і пратэсце. З той пары легендарныя вобразы Сокала і Данка сталі ўвасабленнем мужнасці ў бітве з ворагам, сінонімам чалавечай доблесці і бескарыснага служэння народу.

З гневам і помстай пісаў Горкі аб капіталістычнай сапраўднасці. Яго рэалістычныя апавяданні 90-х гадоў, яго першая вялікая аповесць «Фама Гардзееў», а затым «Трое» і многія іншыя творы той пары выкрывалі звярыную сутнасць уласніцкага свету, дабрабыт якога заснаваны на крыві і грабяжы прыгнечаных, на падаўленні і прыніжэнні чалавечай асобы. У той жа час Горкі раскрыў справядлівую і страшную гісторыю жыцця і пакут абяздоленага гарадскога люду, расказаў аб працы рамеснікаў і рабочых, аб жабраках і жыхарах «дна», аб бадзячай долі басякоў. Цудоўна, што героі з народа — немаёмыя і спагнаныя, бяспраўныя і эксплуатуемыя — у адлюстраванні Горкага нязменна выглядалі горда-непакорнымі і незалежнымі, бескарыснымі і чулымі, духоўна ўзвышанымі, высакароднымі, у маральных адносінах больш прыгожымі, чым тыя, хто насільна прысвоіў права называцца «гаспадарамі жыцця».

Па меры нарастання ў Расіі масавага вызваленчага руху, узначаленага адзіна рэвалюцыйнай партыяй Леніна, усё больш мэтанакіраванай рабілася літаратурная творчасць Горкага. Блізасць да марксістаў, да Леніна арганізавала мяцежны бунт Горкага, «накіравала яго мастацтва да ясна вызначаных і канкрэтных мэт» (А. Талстой). Незадоўга да першай рускай рэвалюцыі Горкі выступае апазяшчальнікам наступаючай сацыяльнай буры, па краіне разносіцца магутны заклік пісьменніка-рэвалюцыянера: «Хай мацней ударыць бура!». Гэты горкаўскі «заклік да барацьбы» разносіўся не толькі ў «Песні пра Буравесніка» — ён быў адчувальным у кожным радку ўзнёслага пісання Горкага ў пачатку веку. Філасофская паэма «Чалавек», драмы «Мяшчане» і «На Дне», п'есы аб лёсе рускай інтэлігенцыі і яе доўгу перад народам, — кожны твор Горкага напярэдадні 1905 года ўспрымаўся сучаснікамі як увасабленне глыбокай веры ў чалавечы розум і ў рэвалюцыйную энергію мас, якія прызваны знішчыць свет прыгнёту і на яго руінах стварыць новы грамадскі лад. Галоўным станоўчым героям сваіх твораў Горкі робіць рабочага-пралетарыя, рэвалюцыянера і камуніста. Бліскучую галерэю такіх новых герояў Горкі яшчэ ў 1902 годзе адкрыў вобразам рабочага-машыніста Ніла.

Для Горкага не існавала разыходжанняў паміж тэорыяй і дзеяннямі, паміж паэтычным словам і надзённа-практычнай справай. У разгар рэвалюцыі 1907 г. ён паказаў сябе нястомна дзейсным рэвалюцыянерам, і адначасова спеваком паўстаўшых народных мас, з выразнай хуткасцю адгукаючыся на розныя колькі-небудзь важныя падзеі той гераічнай эпохі. Іменна тады, пад свежым уражаннем падзей, Горкі піша авеяныя пафасам рэвалюцыйных баёў апавяданні і нарысы, стварае сацыяльную драму «Ворагі», а ўслед за ёю найбольш любімы народам раман «Маці». На гэтым творы, упершыню ў сусветнай літаратуры ствараючым яскравы і праўдзівы вобраз радавога рускага рабочага, які ператварыўся ў прафесіянальнага рэвалюцыянера-ленінца, выхоўваліся ў духу марксізма цэлыя пакаленні рабочых, сялян і інтэлігенцыі ў Расіі і за мяжой. Кніга Горкага, якую Ленін назваў «вельмі своечасовай», адкрывала сабою новую старонку ў сусветным мастацтве, з'явілася адным з першых твораў сацыялістычнага рэалізма. Раманам «Маці» і драмай «Ворагі» Горкі заклаў моцныя асновы сапраўднай народнай пралетарскай літаратуры, якая бурна расцвіла пасля Кастрычніка.

(Працяг на 2-й стар.).



*Кінуўшы позірк на спісаную лічбамі дошку, можна сказаць, што каля яе стаіць матэматык. Але не. З дакладам «Лінгвістычны аналіз лексікі «Песні пра Буравесніка» і яе беларускага перакладу» на Горкаўскай канферэнцыі выступае доктар філалагічных навук прафесар М. Г. Булахаў.*

*Фота І. АСКІРКІ.*

## ПАПРАЎКА ВЕЛЫ

**Імя балгарскай камсамолкі Велы добра вядома савецкай моладзі. Юная патрыётка актыўна ўдзельнічала ў барацьбе супраць манархіі, а пасля супраць фашысцкага рэжыму.**

**У 1942 годзе Вела становіцца членам сельскай баявой падпольнай маладзёжнай групы, затым пераходзіць у партызанскі атрад, у складзе якога змагаецца за новую Балгарыю. За яе галаву фашысты аб'явілі ўзнагароду — 50 тысяч леваў. Загінула Вела ў няроўным баі 3 мая 1944 года.**

**У дзень нараджэння Максіма Горкага мы зноў успамінаем балгарскую студэнтку, якой рускі пісьменнік дапамог выбраць правільны шлях у жыцці. Вела многа чытала, яе любімым пісьменнікам быў Максім Горкі. Неяк, прачытаўшы яго раман «Маці», дзяўчына прыйшла ў клас, сарвала са сцяны партрэт цара і на яго месца павесіла партрэт М. Горкага. Выкліканая для тлумачэння сваіх учынкаў у настаўніцкую, Вела заявіла: «Мой цар — Максім Горкі. Я буду жыць і працаваць так, як ён вучыць».**

**Камсамолка стрымала сваю клятву.**

**Б. РАДАЎ, студэнт.**




# ДАСТОЙНА СУСТРЭНЕМ СЛАЎНЫ ЮБІЛЕЙ

## *Мерапрыемствы рэктарата і парткома*

Дзевяць месяцаў засталося да вялікага свята — 50-годдзя БССР і Кампартыі Беларусі. Да гэтага юбілею актыўна рыхтуецца наш універсітэт. Замацоўваючы і пашыраючы вопыт, які быў накоплен у мінулым годзе па дастойнай сустрэчы 50-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі, рэктарат, партыйныя, камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі, дэканаты і кафедры ўжо шмат зрабілі для таго, каб павялічыць уклад старэйшай навучальнай і даследчай установы рэспублікі ў справы камуністычнага будаўніцтва. Важную ролю, напрыклад, адыграў агульнауніверсітэцкі партыйны сход па пытаннях падрыхтоўкі навуковых кадраў. На ўсіх факультэтах узмацнілася работа па камуністычнаму выхаванню моладзі, удасканаленню вучэбнага працэсу. Нядаўна з вялікім поспехам прайшоў агляд студэнцкай мастацкай самадзейнасці. Такіх прыкладаў можна прывесці многа. Але гэта толькі пачатак.

У распрацаваных рэктаратам і парткомам мерапрыемствах па дастойнай сустрэчы юбілею рэспублікі галоўная ўвага звернута на выкананне факультэтамі сацыялістычных абавязацельстваў. У абавязацельствах жа не абыйдзена ніводнае пытанне універсітэцкага жыцця.

Юбілею рэспублікі будуць прысвечаны навуковыя канферэнцыі прафесарска - выкладчыцкага складу (снежань), маладых вучоных (кастрычнік), тэматычныя вечары, канферэнцыі чытачоў і абмеркаванні кніг. Паўсюдна рыхтуюцца вітрыны, стэнды, на якіх будуць адлюстраваны гісторыя універсітэта, факультэтаў, поспехі беларускай навукі. Рапартам партыі і народу стануць выстаўкі кніг універсітэцкіх аўтараў — вучоных, членаў Саюза пісьменнікаў і Саюза журналістаў, а на філфаку да таго ж адкрыецца выстаўка, прысвечаная жыццю і дзейнасці Якуба Коласа.

Па юбілейнай тэматыцы ўжо актыўна выступаюць нашы лектары — члены таварыства «Веды». Арганізацыі рэкамендавана правесці ва універсітэце і ў падшэфных калектывах цыкл лекцый па такіх пытаннях, як «Развіццё навукі БССР за 50 год», «Роля універсітэта ў падрыхтоўцы нацыянальных кадраў» і інш.

Кіналекторыі, турысцкія паходы, сустрэчы з удзельнікамі рэвалюцыйных падзей і актыўнымі будаўнікамі новай Беларусі, спартыўныя спаборніцтвы і іншыя мерапрыемствы, прысвечаныя святу, будуць садзейнічаць паляпшэнню камуністычнага выхавання моладзі, падрыхтоўкі яе да плённай дзейнасці на карысць Радзіме.

У здзяйсненні мерапрыемстваў рэктарата і парткома, у выкананні сацыялістычных абавязацельстваў факультэтаў павінны праявіць свае здольнасці і магчымасці ўсе выкладчыкі, аспіранты, студэнты і супрацоўнікі. Дзень нараджэння рэспублікі — свята кожнага.

**Загляніце ў любую лабараторыю і вы ўбачыце, як напружана б'ецца пульс студэнцкага жыцця. Праца і пошук — верныя спадарожнікі тых, хто хоча стаць сапраўдным спецыялістам.**

**Паглядзіце, як сканцэнтравана праводзяць доследы ў час практычных заняткаў па аналітычнай хіміі студэнткі першага курса біяфака Надзежда Савачкіна і Людміла Субач.**



**За штодзённымі клопатамі часам і не заўважаеш, якія змены адбываюцца ў прыродзе. А вясна тым часам ідзе.**

**Гэта можна заўважыць не толькі па тым, як веснавое сонца паглынае снег, але і па аб'явах камітэта камсамола, якія сведчаць аб набліжэнні лета, а з ім і трэцяга, працоўнага семестра.**

**Зноў весела і шумна ў камітэце камсамола. Тут пачынаюць фарміравацца «цалінныя» атрады.**

# ЗА ТУМАНАМ І ЗА ВОДАРАМ

**Чытач можа здзівіцца, чаму слова «цалінныя» ў двухкоссі. Справа ў тым, што ў гэтым годзе большасць будаўнічых атрадаў застанецца на юбілейных будоўлях Беларусі — каля 40. І толькі 8 атрадаў паедзе на Урал. Гэта значыць, што студэнты знойдуць рамантычныя і экзатычныя месцы ў розных кутках нашай Беларусі. Ды хіба не цікава будзе працаваць на Палессі на меліярацыйных работах, або на будоўлі самай буйнай у нашай рэспубліцы Лукомльскай ГРЭС!**

**Такім чынам рамантыкі знойдуць свае «туманы і пахі тайгі» ў беларускіх пушчах, адшукаюць стэпавыя прыцуды на беларускіх палях і сенажацях.**

**А. САГАЎ.**

# Як нарадзіліся ВЕРШЫ-ЛІСТОЎКІ



*Георгій Захаравіч Бягун працуе зараз выкладчыкам фотарэпартажа на факультэце журналістыкі. Былы ўдзельнік Друкорска-Пярэжырскага падполля і партызан, ён адзін з тых нямногіх, хто выйшаў з Трасцянецкага канцэнтрацыйнага лагера. Ніжэй друкуем яго ўспаміны і вершы.*

**З першых дзён часовай акупацыі Беларусі ў 1941 годзе гітлераўцы шырока разгарнулі так званую «ідэалагічную апрацоўку» насельніцтва. Гебельсаўская прапагандысцкая машына штодзённа рспаўсюджвала ідэалагічную атруту з тым, каб распаліць нацыянальныя супярэчнасці паміж народамі СССР. Акупанты выкідвалі з самалётаў шматлікія лістоўкі-заклікі да насельніцтва, у якіх загадвалі выдаваць камуністаў і камсамольцаў, абяцалі за гэта вялікія грашовыя ўзнагароды. Крыху пазней у Мінску з ухвалення гебельсаўскай канцылярыі пачаўся выпуск так званай «Беларускай газеты».**

**Наёмныя пісакі з ліку беларускіх нацыяналістаў на ўсе лады расхвальвалі «новы парадак» захопнікаў, стараліся пахіснуць у сэрцах людзей веру ў перамогу Савецкага Саюза.**

**Іменна ў гэтыя дні ў мяне і нарадзілася ідэя складаць вершы, каб расказаць у іх праўду аб захопніках і нават аб тых, хто, як кажуць, «ні нашым, ні вашым».**

**Пісаць вершы аказалася значна цяжэй і складаней, чым я ўяўляў. Але і адмовіцца ад задумы таксама не хацелася.**

**«Ды і не багі плятуць лапці», — суцяшаў я сябе і ўсё пісаў.**

**Неяк у канцы кастрычніка я сустрэў свайго аднавяскоўца Міколу Забаўскага. У першыя месяцы вайны ён, паранены, трапіў у палон, потым уцёк з нямецкага лагера і дабраўся да родных мясцін. Забаўскі пасябраваў з мужам маёй сястры — Рыгорам Аляксандравым і часта прыходзіў да нас. Нярэдка Мікола прыносіў запісаныя зводкі Савінфармбюро. Мікола прачытаў мае творы і папрасіў перапісаць некалькі вершаў, каб размножыць іх як лістоўкі. Развітваючыся ён сказаў:**

**— Давай дамовімся, што з сённяшняга дня ты будзеш па-ранейшаму пісаць вершы, але нікому пра гэта не скажаш. Мы будзем іх перадаваць сваім людзям у розныя вёскі. Зараз вельмі патрэбна трапнае слова пра захопнікаў, пра іх здзекі над нашым народам.**

**Словы Міколы акрылілі мяне. Я адчуў, што патрэбны таварышам па падполлю, што сваімі вершамі магу прынесці карысць у барацьбе з акупантамі. Мне было прыемна, што вершы-лістоўкі прачытаюць людзі не толькі маёй роднай вёскі Пярэжыр, але і многіх іншых. Некаторыя вершы перапісваў друкаванымі літарамі ў некалькіх экземплярах, падпісваючы іх псеўданімам «Яўхімаў».**

**У 1943—1944 гадах работа ў падполлі стала вельмі складанай. Перад намі была пастаўлена задача глыбокай тылавой разведкі. Шмат часу і сіл забірала арганізацыя агентурнай сеткі, шыфроўка сабраных звестак і сувязь з партызанскім атрадам. Я ўсё радзей і радзей думаў аб паэзіі. Апошні верш у час акупацыі напісаў у Трасцянецкім лагеры смерці, у які трапіў у чэрвені 1944 года. Ён так і называўся «Апошняя песня».**

## НОВАЯ ЗБРОЯ ВЕРМАХТА

**Ля Масквы, у баі**
**зацятым**
**Фрыцы дружна далі**
**драпа,**
**А каб ноч не цёрлі боты,**
**Пяткі змазалі тавотам.**
**Прэпарат супраць-**
**мазольны,**
**Апрабованы Адольфам,**
**З генеральскім**
**адабрэннем**
**Рэйх прыняў**
**на ўзбраенне.**
**Сродак, мабыць, вельмі**
**гожы,**
**Ды фашыстам**
**ён паможа**
**Так, як зелле**
**ад знахаркі,**
**Ці як мёртваму**
**прыпаркі.**
**Снежань, 1941 г.**

## *АПОШНЯЯ ПЕСНЯ*

Вольная птушка,
сястрыца,
Вестачку дай
партызанам.
Бачыш — сяджу
у цямніцы,
Рукі жалезам скаваны.
Толькі вось думкі
Рыгора
Нельга скруціць
ланцугамі.
Марна так лютуе
вораг,
Допыты чыніць начамі.
Як бы ні мучылі
каты —
Клятва сяброў
нерушыма.
...Сняцца мне
родныя хаты,
Сцежкі і зоры
Радзімы.
Птушка-галубка,
сястрыца,
Хочацца скінуць
кайданы.
Дай мне хоць кроплю
вадзіцы,
Крыллем абмый мае
раны.
Мне ўжо не суджана
будзе
Жыць пад праменнямі
Сонца.
Птушка, паведамі
людзям,
Як паміраў
камсамолец.
Маці скажы, каб
вясною
Дол не шукала
маўкліва.
Буду шумець
збажынаю,
Буйным калоссем
на ніве.
**1944 г.**

## ХУТЧЭЙ У СТРОЙ, БРАТЫ!

**Землякі-браты!**
**Усе хутчэй у строй,**
**У паход святы**
**За Радзіму ў бой!**
**Кліча нас зямля**
**Супраць ворагаў,**
**Маладосць Крамля —**
**Вежы зорныя.**
**Землякі-браты!**
**У бой з фашыстамі**
**Клічуць нас жыты,**
**Рэчкі чыстыя.**
**Сосны ўзнёслыя,**
**Шып барвовая**
**Травы росныя,**
**Мураговыя.**
**Маці кліча нас**
**За Радзіму ў бой —**
**Дык не трацьце час,**
**Дык хутчэй у строй.**
**1941 г.**

# СЕМЕСТРЫ СТАЛАСЦІ

Прайшоў вучэбны семестр, прайшла першая ў нашым жыцці і, безумоўна, самая цяжкая сесія. Першы курс выйшаў з яе «у поўным складзе» і з нядрэннымі вынікамі. Узнагародай за працу з'явіліся для першага курса гісторыкаў 28 выдатнікаў; 67 студэнтаў здалі сесію на «добра». Цяпер перадэкзаменацыйныя хваляванні адкладзены да чэрвеня. Камсамольцаў курса больш хвалююць праблемы арганізацыі цікавага жыцця на курсе, прылучэння да навуковай працы, да змястоўнага адпачынку.

На працягу першага семестра наша камсамольская арганізацыя працавала не на поўную сілу. Усе мерапрыемствы, праведзеныя курсам, не заслугоўваюць падзякі, таму што яны не ставілі сваёй мэтай выхаванне моладзі.

Цяпер асноўная цяжкасць (з чаго пачаць?) мінула. З другога семестра камсамольскае бюро з энтузіязмам узялося за працу. Вызначан план работы на семестр. Але тут узніклі чарговыя праблемы: кожнае мерапрыемства можна правесці па-рознаму. Ды і самі мерапрыемствы выбраць не так лёгка. Канферэнцыі чытачоў, дыспуты, экскурсіі, гутаркі, палітінфармацыі не заўсёды могуць задаволіць студэнтаў курса, чацвёртая частка якога ў мінулым —сакратары школьных камсамольскіх арганізацый.

Камсамольскае бюро хвалюе праблема правільнага разумення духоўных запатрабаванняў студэнтаў і на гэтай аснове выпрацоўка свайго стылю ў працы. Арганізацыя спаборніцтва паміж вучэбнымі групамі, анкета «Чаму ты выбраў прафесію гісторыка?», думаецца, высвятляць асноўныя напрамкі ў працы.

Многія студэнты скардзяцца, што на курсе бывае сумна. Яны правы ў тых адносінах, што да гэтай пары ў нас не арганізаван па-сапраўднаму культурны адпачынак. На пасяджэннях камсамольскага бюро мы абмяркоўвалі гэтае пытанне, але зноў паўстала праблема: як арганізаваць на курсе вечар, як зацікавіць камсамольцаў, каб на працягу нядзелі яны змаглі і да заняткаў падрыхтавацца і арганізаваць культпаход у музей або тэатр?

Тут нам павінен дапамагчы камітэт камсамола. На гістарычным факультэце ёсць добрыя традыцыі— дапамажыце нам прылучыцца да іх.

І яшчэ: перад нашымі адказнымі за сектары камсамольскай работы ў бюро таксама праблема ў вызначэнні профілю і стылю работы. Лепшым спосабам яе вырашэння будзе пастаяннае шэфства старшакурснікаў, членаў бюро, якія адказваюць за аналагічныя сектары. Дабавіўшы да гэтага жывую творчасць студэнтаў курса, іх камсамольскі агеньчык і ініцыятыву, можна цвёрда спадзявацца на захаванне слаўных традыцый гістфака.

*М. ЧАСНОЎСКІ,*
*сакратар камсамольскага бюро І курса гістфака.*

## БЕЗ КАНІКУЛ

## З МАРАЙ АБ БУДУЧЫМ

**Здаецца, мы толькі нядаўна сустрэліся на першай універсітэцкай установачнай сесіі, а цяпер — глядзіш, і першая экзаменацыйная праляцела. У студэнтаў-завочнікаў няма канікул. Зноў работа, падручнікі, бібліятэка. Для некаторых ужо стала звычайным рэдакцыйная мітусня, бясконцыя тэлефонныя размовы, сустрэчы і аловак з блакнотам. Другія вядуць школьныя ўрокі, трэція зноў кожны ранак спяшаюцца да завадской прахадной, чацвёртыя... Праца ва ўсіх розная, але згуртоўвае нас адно: прага да ведаў, бясконцы пошук.**

**Сесія закончылася, але засталіся ўспаміны. Цяпер мы ўжо пераканаліся, што гады вучобы ва універсітэце будуць самымі шчаслівымі ў жыцці. Ужо на першых лекцыях мы пачулі многа новага і цікавага. І кожны, напэўна, яшчэ раз пераканаўся, што прафесію выбраў па прызванню.**

**Журналістаў у час сесіі можна было бачыць усюды. Але, мабыць, часцей за ўсё каля падаконнікаў. Гэта лепшае месца для шчырых размоў. За некалькі дзён хочацца ўсё схапіць.**

**— Пакажы, што ты ўчора напісаў!..**

**— Ведаеш, чытаў тваю замалёўку ў «Знамёнцы». Нічога сабе.**

**І наколькі дарагая пахвала аднакурсн[illegible]**

**Пасля зноў спрэчкі.**

**— Ці заўсёды сціласць сястра таленту! А як жа тады Талстой, Шэкспір, Бальзак!**

**Мінула сесія... Лекцыі, экзамены, залікі. Цяпер мы рыхтуемся да летняй сустрэчы.**

**Г. АДАМСОН,**
**студэнтка І курса завочнага факультэта.**



Фотаэцюд С. Супруна.

Я прыйшла—
Вы мяне паклікалі—
Быццам венікам, снег
падмяла.
Я вясна — галасістая каня.
Я вярнулася.
Я прыйшла.
Салаўя аж з-пад сонца
прынесла—
Не журыцеся больш кусты!

Сёння песню, рачную
песню
Разгайдалі, панеслі плыты.
А ў мяне столькі клопатаў...
Сок галінкай цягнуць
да нябёс,
Каб да 1 Мая лопнулі
У паветры пупышкі бяроз.

**М. Дукса.**

# НЕЗВЫЧАЙНАЕ ВЫДАННЕ

*У мінулым годзе на факультэце журналістыкі «выйшла» у свет незвычайнае машынапіснае, усяго ў трох экзэмплярах выданне — альманах «Творчасць журналіста».*

*Гэта альманах пачынаючых. У ім змешчаны творы 19 студэнтаў: вершы, рэцэнзіі, гумарэскі, даследаванні і нават урыўкі з кінасцэнарыя.*

*Вельмі цікавы пачын. Дакладней, адраджэнне традыцыі 50-х гадоў.*

*Для ўсіх відавочна, што вялікі калектыў студэнтаў журналістаў валодае значным творчым патэнцыялам. І трэба стварыць усё магчымае да яго праяўлення.*

*Паспрабуем жа вытлумачыць, ці адпавядае альманах сваёму назначэнню, ці ён чарговае «мерапрыемства» дзеля «галачкі».*

*Падзагаловак тлумачыць: «Навукова-публіцыстычны альманах». На навуковасць прэтэндуюць пяць работ гэтага зборніка. Гэта даследаванні творчасці вядомых публіцыстаў: А. Луначарскага, М. Кальцова, Э. Кіша, С. Смірнова і Л. Ліхадзеева.*

*Вядома, што ў працэсе вучобы студэнты пішуць такія працы (курсавыя, дыпломныя) дзесяткамі і сотнямі. За гады выпрацаваліся пэўныя спосабы іх напісання. І нягледзячы на рознастайнасць тэм, яны паражальна стандартныя. Спачатку, звычайна, пералічваецца, што напісаў публіцыст, пасля ўсё аб'яўляецца таленавітым. Затым, для перакананасці прыводзяцца прыклады; у канцы, як правіла, разбіраецца мова і стыль—зноў прыклады, цытаты і сцвярджэнне — вось гэтае слова, выражэнне з'яўляецца адзіна правільным, цікавай знаходкай аўтара.*

*Навуковыя даклады, якія змешчаны ў альманаху, у многім адступаюць ад гэтых стандартных форм. Іх аўтары асноўную ўвагу сканцэтроўваюць на вытлумачэнні асаблівасці майстэрства публіцыстаў, іх творчай лабараторыі. І гэтым яны карысны для многіх.*

*Змешчаны ў альманаху і іншыя творы пачынаючых (ад гэтага альманах стаў універсальным зборнікам); сямнаццаць старонак вершаў, якія належаць сямі студэнтам, дзве рэцэнзіі, тры апавяданні, гумарэска і ўрыўкі з кінасцэнарыя. Яны розныя па зместу і па якасці. Ёсць даволі недасканалыя. Іх зусім не варта было змяшчаць. Але ў цэлым альманах цікавы. Пачынанне гэта патрэбна прадоўжыць, але на больш высокім навуковым і творчым узроўні. Добра было б, калі б гэты альманах выдаваўся хоць бы на ратапрынце.*

*І. ФІЦНЕР,*
*студэнт 6-га курса вячэрняга аддзялення.*

## АГУЛЬНАЕ СВЯТА

26 сакавіка споўнілася 37-я гадавіна з дня заснавання Саюза працоўнай моладзі В'етнама. У гэты дзень нашы студэнты, члены бюро камітэта камсамола, сустрэліся з в'етнамскімі студэнтамі, якія займаюцца ва універсітэце.

У час гэтай сустрэчы в'етнамскія сябры расказалі аб гісторыі Саюза працоўнай моладзі В'етнама, аб мужнай барацьбе свайго народа з амерыканскімі агрэсарамі, аб маладых в'етнамскіх героях, якія, не шкадуючы жыцця, змагаюцца за свабоду і незалежнасць сваёй Радзімы.

У сваю чаргу, сакратар камітэта камсамола Міхаіл Ціва расказаў в'етнамскім сябрам аб гістарычным шляху ленінскага камсамола, аб жыцці камсамольскіх арганізацый факультэтаў і аб тым, якія задачы стаяць зараз перад камсамольцамі нашай краіны.

Студэнцкі клуб «Праметэй», створаны на І курсе факультэта журналістыкі, мае вялікае кола прыхільнікаў — аматараў мастацкага слова, музыкі, песні.

НА ЗДЫМКУ: члены клуба выступаюць перад слухачамі з новымі песнямі. Фота П. ПАБОКІ.

Палёт (справа). Фотаэцюд У. ФІЛАТАВА.





**Адказны рэдактар М. ІОСЬКА.**

АТ 02137 Зак. № 545. Наш адрас: Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон Б-2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда».